# Журналістыка

*А.А. ГРАДЗЮШКА*

## ДЗЕЙНАСЦЬ ЮНЕСКА ПА СТВАРЭННЮ НОВАЙ МІЖНАРОДНАЙ ІНФАРМАЦЫЙНАЙ І КАМУНІКАЦЫЙНАЙ ПРАСТОРЫ НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ

Вядомы палітычны дзеяч Англіі Уінстан Чэрчыль аднойчы заўважыў, што, хто валодае інфармацыяй, той валодае і светам. Сёння на нашых вачах адбываецца сапраўдны "выбух" у галіне інфармацыі і камунікацыі. Па статыстыцы на сярэдзіну 2000 г. на планеце налічвалася больш за 200 млн карыстальнікаў сеткі Інтэрнет. Новыя тэхналогіі нясуць з сабой не толькі відавочныя выгады, але і шматлікія праблемы.

Перш за ўсё іх асваенне пагражае далейшым паглыбленнем дыспрапорцыі ў вытворчасці і распаўсюджванні інфармацыі паміж развітымі дзяржавамі і краінамі трэцяга свету, на што шмат гадоў звяртае ўвагу ЮНЕСКА. Перад гэтай аўтарытэтнай міжнароднай арганізацыяй у адпаведнасці з яе Статутам стаіць задача садзейнічаць "свабоднаму распаўсюджванню ідэй вусным і выяўленчым шляхам", а таксама "збліжэнню і ўзаемнаму паразуменню народаў шляхам выкарыстання ўсіх сродкаў інфармацыі"[1] (тут і далей пераклад аўтара. – А. Г.) незалежна ад эканамічнага стану той ці іншай краіны.

Па меркаванню былога Генеральнага дырэктара ЮНЕСКА Амаду Махтара М'Боу, які яшчэ ў 1984 г. упершыню звярнуў увагу на праблему інфармацыйнага абмену паміж развітымі дзяржавамі і краінамі ў стадыі развіцця, адзначыўшы, што "...адной з найвялікшых форм няроўнасці ў свеце з'яўляецца няроўнасць у галіне інфармацыі"[2]. Пацвярджэннем гэтага могуць служыць лічбы, якія прыводзяцца ў Сусветным дакладзе ЮНЕСКА аб камунікацыі і інфармацыі ў 1999–2000 гг., якія вельмі красамоўна характарызуюць становішча на сусветным камунікацыйным рынку і яго негатыўныя вынікі.

Даклад сведчыць аб тым, што ў 1996 г. агульная колькасць камп'ютэраў у свеце складала 234,2 млн адзінак. Пры гэтым на 100 чалавек у Еўропе прыходзілася 9,6 персанальных камп'ютэраў, у ЗША – 36,2, у Японіі – 12,8, а ў Афрыцы – толькі 0,64 камп'ютэра на сто жыхароў. Прыкладна такая ж сітуацыя і з размеркаваннем сродкаў тэлефоннай сеткі: у Еўропе, ЗША і Японіі знаходзілася 68 % ад агульнай колькасці тэлефонаў і факсаў, у той час як у Афрыцы – толькі 1,8 %[3]. Дысбаланс паміж развітымі краінамі і дзяржавамі, якія развіваюцца, відавочны таксама ў галінах тэлеіндустрыі, паслуг сеткі Інтэрнет і іншых камунікатыўных рэсурсаў, што прыводзіць да так званага "інфармацыйнага каланіялізму".

Падобнае становішча пачало непакоіць ЮНЕСКА яшчэ ў канцы 70-х – пачатку 80-х гг., а сёння мы назіраем усё большае імкненне індустрыяльна развітых краін правесці глабалізацыю сусветнай інфармацыйнай і камунікацыйнай прасторы і стварыць дыспрапорцыі. Паступова абмен інфармацыяй



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

пачынае нагадваць "вуліцу з аднабаковым рухам", а некаторыя спецыялісты гавораць нават аб з'яўленні "інфармацыйных супермагістралей". Праблема раўнапраўнага абмену інфармацыяй ускладняецца адсутнасцю капітала ў краін трэцяга свету для закупкі неабходнага камунікацыйнага абсталявання І экспансіяй індустрыяльна развітых дзяржаў на іх рынкі.

Праблемы стварэння новай міжнароднай інфармацыйнай і камунікацыйнай прасторы знайшлі сваё адлюстраванне ў Сярэднетэрміновай стратэгіі ЮНЕСКА на 1996–2001 гг. Як адзначаецца ў гэтым дакуменце, паскоранае развіццё новых тэхналогій адкрывае шматабяцаючыя перспектывы ў доступе да адукацыі, цыркуляцыі дадзеных, інтэнсіфікацыі навуковага супрацоўніцтва і пашырэння культурных абменаў. Пры гэтым разам з "інфармацыйнымі магістралямі", колькасць якіх будзе расці ў прамыслова развітых дзяржавах, трэба яшчэ пракласці пачатак "інфармацыйных прасёлкаў" у многіх краінах з мэтай задавальнення патрэбнасцей мясцовага насельніцтва.

Паняцце "камунікацыя" не сустракаецца ў назве ЮНЕСКА, тым не менш важнасць гэтай галіны ўсе больш прызнаецца менавіта на сучасным этапе, і на яе штогод выдзяляецца каля 10 % сродкаў рэгулярнага бюджэту арганізацыі. Перш за ўсё ў адпаведнасці з Сярэднетэрміновай стратэгіяй на 1996–2001 гг. дзейнасць ЮНЕСКА, з аднаго боку, накіравана на садзейнічанне свабоднаму распаўсюджванню інфармацыі як на міжнародным, так і на нацыянальным узроўнях, забеспячэнне яе больш шырокага і лепш збалансаванага распаўсюджвання без якіх-небудзь абмежаванняў, а з другога боку – на замацаванне магчымасцей у галіне камунікацыі краін трэцяга свету.

Першае месца на сусветнай інфармацыйнай і камунікацыйнай прасторы займаюць ЗША, якім належыць каля 48,7 % рынка, дзе згодна з дадзенымі на сярэдзіну 1998 г. сеткай Інтэрнет карысталіся больш за 25 % жыхароў, тады як у Фінляндыі гэты паказчык складаў 20,4 %, у Швецыі – 14,8 %, у Даніі – 12,8 %, Іспаніі, Італіі і Партугаліі – каля 3 %, а ў краінах трэцяга свету – не больш за 0,005–0,02 % насельніцтва, тады як у Беларусі – каля 1,5 %[4]. Да гэтага яшчэ на V Еўрапейскай канферэнцыі міністраў інфармацыі (Салонікі, 1997 г.) гучалі заклікі да "еўрапейскага адказу" на амерыканскі націск у інфармацыйнай сферы, які пацягне за сабой "інфармацыйны каланіялізм".

План мерапрыемстваў ЗША ў галіне нацыянальнай інфармацыйнай інфраструктуры (NII), зацверджаны ў 1993 г., прадугледжвае панаванне на сусветным рынку інфармацыйных тэхналогій. Перш за ўсё пад гэтым трэба разумець дзеянні, накіраваныя на дасягненне інфармацыйнай перавагі над дзяржавамі трэцяга свету ў інтарэсах нацыянальнай стратэгіі і ажыццяўляемыя шляхам уздзеяння на інфармацыю і адпаведныя сістэмы іншых краін пры адначасовай абароне ўласных сродкаў мас-медыя.

Падобныя ініцыятывы выклікалі неадкладную рэакцыю ЕС, які асцерагаўся саступіць пазіцыі ЗША і заявіў аб неабходнасці стварэння ў кароткі тэрмін еўрапейскага супольніцтва інфармацыі. Пасля гэтага ў ліпені 1994 г. Еўрапейская камісія надрукавала паведамленне "Шлях Еўропы да інфармацыйнага грамадства", у якім быў выкладзены план дзеянняў на бліжэйшую перспектыву. Пачынаючы з сярэдзіны 90-х гг. пачалі распрацоўвацца новыя падыходы ў галіне інфармацыйнай еўрапейскай палітыкі, дзе падкрэслівалася неабходнасць звярнуць увагу на магчымыя сацыяльныя наступствы, якія можа прынесці з сабой "інфармацыйнае грамадства".

Даволі слушнымі ў гэтым кантэксце ўяўляюцца словы эксперта ЮНЕСКА ў сферы сродкаў масавай камунікацыі Шона Макбрайда, які адзначыў: "Прымаючы больш шырокі размах у сілу дыверсіфікацыі і пашырэння сродкаў масавай інфармацыі, пад дэфектамі (недахопамі) у перыяд "новай эры" камунікацыі сталі ўсё часцей мець на ўвазе "свабоду інфармацыі", "свабод-



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

ны паток інфармацыі", "аднабаковы паток інфармацыі", свабодны доступ да сродкаў масавай інфармацыі, якія з'яўляюцца развіццём асноўнага прынцыпу свабоды і пераканання, але яны нарадзілі ў сучасным свеце дыспрапорцыі, няроўнасць, дысбалансы і аднабаковасць атрымання інфармацыі рознымі кантынентамі і рэгіёнамі"[5].

Даклад ЮНЕСКА аб камунікацыі і інфармацыі ў 1999–2000 гг. таксама сведчыць аб прыўнясенні негатыўных момантаў, сярод якіх варта адзначыць новае размеркаванне працы і грашовых сродкаў паміж дзяржавамі. Падобнае палажэнне не абяцае нічога добрага для краін трэцяга свету, бо дапамагчы ім мала хто захоча, ды і не зможа. Па меркаванню былога Генеральнага дырэктара ЮНЕСКА Федэрыка Маёра, выгады ад сучасных тэхналогій могуць быць манапалізаваны новай сусветнай элітай. Дагэтуль нацыянальныя ўрады ажыццяўлялі жорсткі кантроль над тэлекамунікацыйнымі сістэмамі і перамяшчэннем праз межы сваіх краін кніг і кінафільмаў, а з развіццём сеткі Інтэрнет верагоднасць "інфармацыйнай экспансіі" рэзка павялічылася.

Дзяржавы, якія знаходзяцца ў сферы ўздзеяння механізмаў глабальнага рынку, могуць страціць сваю індывідуальнасць і непаўторнасць культурнай сферы. Змены на інфармацыйнай прасторы непазбежна накладваюць свой адбітак таксама на эканамічную і палітычную вобласці. Таму неабходна знайсці ўзважаны падыход да новых інфармацыйных і камунікацыйных тэхналогій, старанна супастаўляючы іх магчымасці з адмоўнымі наступствамі, бо ўзнікненне новых медыяімперый нясе ў сабе небяспеку нацыянальнай інфармацыйнай прасторы любой краіны.

Па словах цяперашняга Генеральнага дырэктара ЮНЕСКА Коічыра Мацуура, гэтая міжнародная арганізацыя не можа прэтэндаваць на ролю даследчага інстытута, а павінна стымуляваць правядзенне актуальных даследаванняў. Пры гэтым асноўная роля ЮНЕСКА заключаецца ў садзейнічанні збліжэнню ідэй, ведаў і імкненняў, а таксама паступоваму фарміраванню грамадскай думкі ў галіне стварэння новай інфармацыйнай і камунікацыйнай прасторы "з мэтай дасягнення... міру ва ўсім свеце і ўсеагульнага дабрабыту чалавецтва", як гаворыцца ў яе Статуце.

Дзейнасць ЮНЕСКА на сучасным этапе ў галіне фарміравання новай міжнароднай інфармацыйнай і камунікацыйнай прасторы ажыццяўляецца пры дапамозе шэрага метадаў і прыёмаў. Арганізацыя садзейнічае прымяненню новых тэхналогій збалансаванага абмену інфармацыяй паміж дзяржавамі, каб краіны трэцяга свету больш актыўна ўдзельнічалі ў працэсе развіцця камунікацыі. У гэтым кантэксце ЮНЕСКА з'яўляецца галоўным сусветным генератарам ідэй. Пад эгідай арганізацыі абмяркоўваюцца пытанні незалежнасці журналістаў, замацавання пазіцый СМІ краін у стадыі развіцця, а таксама вядзецца прапагандысцкая дзейнасць.

Для незалежных мясцовых газет у краінах трэцяга свету выкарыстоўваюцца шматлікія рэгіянальныя і нацыянальныя навучальныя праграмы ЮНЕСКА, якія з'яўляюцца важнай часткай развіцця сродкаў камунікацыі. Дадзеная работа вядзецца, напрыклад, Глабальнай сеткай вучэбных журналісцкіх цэнтраў і устаноў (Global Network of Journalism Training Centres and Institutes), што была арганізавана ў 1997 г. і пачала работу пры садзейнічанні Праграмы па развіццю камунікацыі ў 1999 г. Яе дапаўняе дзейнасць кафедр камунікацыі пры універсітэтах, уключаючы, напрыклад, нядаўна створаную пры Універсітэце Сук Мюнга ў Сеуле (Паўднёвая Карэя).

Даволі важную ролю ў дзейнасці ЮНЕСКА выконвае таксама створаная ў 1980 г. Міжнародная праграма развіцця камунікацыі (МПРК), якая накіравана выключна на развіццё сродкаў масавых камунікацый і інфраструктур краін трэцяга свету. Пасля стварэння МПРК і да сённяшняга часу на яе спецыяльны рахунак паступіла каля 41 млн дол., яшчэ каля 45 млн дол.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

было атрымана на ажыццяўленне праектаў рознымі фондамі; выплата асобнымі краінамі членскіх узносаў дазволіла падрыхтаваць 1500 спецыялітаў па камунікацыі.

Праекты, фінансуемыя ў рамках МПРК, прадугледжваюць шырокае кола дзейнасці, накіраванае на ажыццяўленне канцэпцыі плюралізму і незалежнасці СМІ. Перш за ўсё гэта арганізацыя каналаў радыёвяшчання на месцах, выпуск газет для вясковага насельніцтва, навучанне журналістаў для ўсіх відаў СМІ, камп'ютэрызацыя рэдакцый інфармацыйных агенцтваў, тэлеканалаў, радыёстанцый і газет. Прымаючы да ўвагі важнасць прафесійных навыкаў для развіцця "інфармацыйнага грамадства", ЮНЕСКА надае асаблівае значэнне падрыхтоўцы і павышэнню кваліфікацыі галіновых спецыялістаў (бібліятэкараў, супрацоўнікаў інфармацыйных службаў і інш.). Першачарговае значэнне ў гэтай сферы таксама мае дзейнасць сеткі кафедр ЮНЕСКА ў галіне камунікацыі (ОРБИКОМ) і сеткі асацыяніраваных школ журналістыкі.

Даволі змястоўнай уяўляецца і нарматыўная дзейнасць ЮНЕСКА, якая датычыцца прыняцця міжнародных канвенцый і рэкамендацый. Дадзеныя дакументы прызваны мабілізаваць палітычных кіраўнікоў самага высокага ўзроўню на фармуляванне пэўных задач і распрацоўку планаў дзеянняў, а таксама прыняцце цвёрдых абавязацельстваў у дачыненні мер для выканання гэтых задач. Дадаткова ЮНЕСКА ажыццяўляе на сусветным узроўні збор матэрыялаў, якія датычаць інфармацыі і камунікацыі. Распаўсюджванне спецыялізаваных звестак адбываецца праз дакпады ЮНЕСКА аб стане адукацыі, навукі і камунікацыі ў свеце, якія потым выдаюцца ў Парыжы раз у два гады асобнай кнігай.

Прыкладам можа служыць апошні Сусветны даклад ЮНЕСКА аб камунікацыі і інфармацыі ў 1999–2000 гг. аб'ёмам 283 друкаваныя старонкі, у якім вядучыя спецыялісты ўсіх кантынентаў сумесна ацэньваюць стан і перспектывы развіцця сеткі Інтэрнет, тэлебачання і іншых сродкаў масавай інфармацыі і камунікацыі з пункту гледжання іх наступстваў для грамадства. Згодна з меркаваннем Генеральнага дырэктара ЮНЕСКА Федэрыка Маёра, якое ён выказвае ва ўступе, "Сусветны дакпад ЮНЕСКА аб камунікацыі і інфармацыі ў 1999–2000 гг. быў распрацаваны зыходзячы з намераў... перашкодзіць разрыву, які павялічваецца паміж краінамі з высокім узроўнем развіцця інфармацыйных тэхналогій і тымі, хто толькі пачынае іх прымяняць"[6].

Падводзячы вынікі, адзначым наступнае: узнікненне новых медыяімперый у ЗША і іншых індустрыяльна развітых дзяржавах, а таксама іх агрэсіўная палітыка ў галіне інфармацыйных тэхналогій сёння сур'ёзна пагражае дзяржавам трэцяга свету. Дзейнасць ЮНЕСКА па фарміраванню новай міжнароднай інфармацыйнай і камунікацыйнай прасторы накіравана супраць ажыццяўлення гэтых планаў.

[1] Свод нормативных актов ЮНЕСКО: конвенции и соглашения, рекомендации и декларации. М., 1991. С. 25.
[2] Tunisia. Secretariat of State for Information. The New Order for Information.Tunis, 1977. P. 40.
[3] Гл.: Всемирный доклад ЮНЕСКО о коммуникации и информации в 1999–2000 гг. М., 2000. С. 48.
[4] Гл.: Там жа. С. 67.
[5] UNESCO News. Paris, 1992. January – February. P. 7.
[6] Всемирный доклад ЮНЕСКО о коммуникации и информации в 1999–2000 гг. М., 2000. С. 12.

***Градзюшка Аляксандр Аляксандравіч*** – аспірант кафедры замежнай журналістыкі і літаратуры БДУ. Навуковы кіраўнік – доктар гістарычных навук, прафесар І.І. Сачанка.

This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.

To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm